УДК 940.5(476)

*А.Л.ДЗЯДЗІНКІН*

# РЭПРЭСІІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 1920 – 1930-х ГАДОЎ ЯК АДЗІН СА СРОДКАЎ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ НА БЕЛАРУСІ

Сталінскі палітычны курс у 1930-я гады вызначаўся не аднымі толькі ідэалагічнымі і прапагандысцкімі кампаніямі. Гэта быў час жорсткіх рэпрэсій, якія з'яўляліся, на думку І.Сталіна, "неабходным" элементам наступлення сацыялізма. Рэпрэсіі пачаліся на Беларусі ўжо ў канцы 1920-х гадоў, але найбольшы іх пік прыйшоўся на 1937 – 1938 гады. На гэта былі свае прычыны. Па-першае, у міжваенны перыяд тэрыторыя БССР знаходзілася ў непасрэднай блізасці да "санітарнага кардону", – краін, якія арыентаваліся на ўплывовыя капіталістычныя дзяржавы свету. Гэта абумовіла правядзенне такой палітыкі, якая б забяспечвала "надзейнасць" заходніх рубяжоў. Па-другое, БССР з'яўлялася не толькі памежнай, але і шматнацыянальнай дзяржавай, дзе пражывалі прадстаўнікі шматлікіх нетытульных этнічных супольнасцей. З гэтай прычыны мясцовыя кіруючыя органы ставілі задачу канчаткова ліквідаваць у дадзеным рэгіёне сацыяльную базу, здольную падтрымаць эмігранцкія "контррэвалюцыйныя" настроі. Многія з рэпрэсаваных у выніку абвінавачваліся ў нацыянал-ухілізме, сепаратызме, шпіянажы, здрадзе Радзіме. Рэпрэсіі былі поўнасцю звязаны з адчуваннем пачатку вайны, са страхам перад "пятай калонай", з уяўленнем аб варожым акружэнні, пад якім акрамя Германіі разглядаліся ў першую чаргу краіны, якія межавалі з СССР. Як бачна, ідэі нацыянальнага і дзяржаўнага патрыятызма, ваенна-дзяржаўнага супрацьстаяння, якія сталі ўсё ў большай ступені вызначаць нацыянальную палітыку з сярэдзіны 1930-х гадоў, адсунулі на задні план традыцыйныя схемы класавай барацьбы і ў многім абумовілі жорсткасць рэпрэсій супраць усіх, хто быў прама ці ўскосна звязаны з дзяржавамі "варожага акружэння".

У ліпені 1937 г. Палітбюро ЦК КП(б)Б пастанавіла "дать немедля приказ по органам НКВД об аресте всех немцев, работающих на заводах... О ходе арестов и количестве арестуемых сообщать сводки в ЦК" [1]. Адпаведны загад, які датычыўся ўсіх германскіх падданых, быў выдадзены 25 ліпеня гэтага ж года, а 30 ліпеня быў падпісаны яшчэ адзін цыркуляр, які адносіўся ўжо да ўсіх савецкіх грамадзян нямецкай нацыянальнасці. У жніўні 1937 г. паявіліся аналагічныя рашэнні адносна палякаў, а затым адносна латышэй, эстонцаў і некаторых іншых супольнасцей. Рэпрэсіі па нацыянальнаму прызнаку не абышлі і Чырвоную Армію. 10 сакавіка 1938 г. Г.Маленкоў даручыў Л.Мехлісу падрыхтаваць спісы армейскіх камуністаў – палякаў, немцаў, латышэй і прадстаўнікоў іншых этнічных супольнасцей, якія мелі дзяржаўныя ўтварэнні за межамі СССР. Загад быў выкананы, і 24 чэрвеня таго ж года была выдадзена дырэктыва наркома абароны, згодна з якой з войска звальняліся ваеннаслужачыя ўсіх нацыянальнасцей, не ўваходзячых у склад Савецкага Саюза. Аналагічна пачалася чыстка другой сілавой структуры. І.Яжоў, прызначаны на пост наркома ўнутраных спраў 26 верасня 1936 г., адзначаў: "Придя в органы, начал свою работу с разгрома польских шпионов, которые пролезли во все отделы ЧК". У маі 1938 г. ЦК КП(б)Б даў указанне аб звальненні з органаў усіх супрацоўнікаў, якія мелі родных за мяжой і паходзілі з дробнай буржуазіі [2].

На Беларусі рэпрэсіям па нацыянальнай прыкмеце, па-першае, падвяргаліся пераважна немцы, палякі і латышы, якія ў дарэвалюцыйны час былі буйнымі

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

землеўладальнікамі альбо займалі адміністрацыйныя пасады. Звычайна гэтая катэгорыя грамадзян абвінавачвалася адпаведна артыкулу 58 УК БССР – за здраду Радзіме. Сапраўды, толькі ў 1925 г. у Віцебскай акрузе 126 сямей былых памешчыкаў былі высланы за межы Беларусі (каля 40% – палякі, 8% – латышы [3]. Па-другое, рэпрэсавалі людзей, якія мелі родных за мяжой і атрымлівалі адтуль матэрыяльную дапамогу. Гэтая катэгорыя грамадзян абвінавачвалася адпаведна артыкулу 68 УК БССР – за шпіянаж. Да прыкладу, беларуская сялянка, атрымаўшая з Польшчы "три отреза материала" ў 1935 г. была выслана за Урал на 3 гады [4]. Па-трэцяе, рэпрэсавалі за сувязь з "клерыкальнымі элементамі", што правакавалі антысавецкія настроі. Гэтую катэгорыю грамадзян абвінавачвалі адпаведна артыкула 72 УК БССР – за прапаганду і агітацыю супраць савецкай улады. Так, на аснове агентурных дадзеных, на Беларусі праходзіла слуханне справы "Патрыёты" аб нацыяналістычнай польскай і рэлігійнай агітацыі [5]. У выніку была арыштавана вярхушка каталіцкага актыву Віцебска. Па-чацвёртае, па нацыянальнай прыкмеце "шкоднікаў" выходзілі на прамысловых прадпрыемствах. У 1933 г. у дакладзе АДПУ аб напружаным становішчы на фабрыцы "КІМ" вызначаліся групы "злачынцаў", што ўяўлялі пэўную небяспеку для савецкай улады: сіяністы, бундаўцы, нацдэмы. [6]. Як бачна, нацыянальная палітыка савецкай улады ў канцы 1920-х – 1930-я гады пацярпела сур'ёзную дэфармацыю. Этнічныя чысткі паставілі пад пагрозу само існаванне некаторых этнічных супольнасцей Беларусі. Палітыка рэпрэсій 1920-х – 1930-х гадоў, якая праводзілася ў адносінах да нацыянальнага насельніцтва, паклала пачатак будучай нестабільнасці дзяржавы, нанесла значны ўрон усім сферам грамадскага развіцця.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. НАРБ. Ф.4-п. Воп.1. Спр.45. Арк. 12.
2. Там жа. Арк. 78.
3. ДАВВ. Ф.102. Воп.1. Спр.377. Арк. 14.
4. Там жа. Спр. 177. Арк.67.
5. Там жа. Спр. 565. Арк.61.
6. Там жа. Спр. 377. Арк.52.


## SUMMARY

*The object of our research is the national politicy of the Soviet government in Belarus. The author has analyzed some questions of national state poiiticy and international relations.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова